Лучайская парафія ў чацвёрты раз сабрала вернікаў на Дзень святасці сям'і. Асаблівая атмасфера пануючая заўседы ў гэты дзень не стала выключэннем і 28 чэрвеня. Сямейныя пары, для якіх сёлетні год стаў юбілейным, сабраліся, каб аднавіць шлюбную прысягу. Сярод іншых вернікаў і сем'яў прыбылі і нарачоныя, якія рыхтуюцца да сакраманту сужэнства.



Рапачаўся Дзень святасці сям'і з канферэнцыі, якую праводзіў Ян Пузанаў з Віцебска –

прадстаўнік дабрачыннага фонду "Адкрытыя сэрцы", які выступае ў абарону жыцця і сям'і. Галоўнай думкай выступлення было: "Ад сям'і залежыць наша будучыня". Падчас адарацыі Найсвяцейшага Сакраманту прагучала малітва святога Яна Паўла II за сем'і. Разважанні, якія чытала сямейная пара, таксама часткова складалася з выказваняў святога Пантыфіка "Сям'я – гэта шлях Касцела. Гэта першы, найважнейшы, агульны, асаблівы, адзіны і непаўторны шлях, як і сам чалавек".

Святая Імша ў інтэнцыі сужэнстваў стала кульмінацыйным момантам свята. Ксёндз пробашч Мікалай Ліпскі ў сваёй гаміліі пракаментаваў Евангелле, а таксама звярнуўся да сужонкаў словамі папы Францішка, якія адкрываюць шлях да добрага сямейнага жыцця, з'яўляюцца простымі і адначасова нялёгкімі на практыцы тры словы: "дазволь, дзякуй, прабач". Святар падрабязна растлумачыў сэнс і важнасць гэтых простых словаў у сямейным жыцці і пажадаў прысутным, каб тры каштоўныя выразы занялі належнае месца ў сэрцах людзей, іх дамах і ў адносінах з іншымі людзьмі. Гамілія стала добрай падрыхтоўкай да аднаўлення шлюбнай прысягі. Сёлета прысутнічалі тры сужэнствы-юбіляры, якія зноў падалі адзін аднаму правыя рукі і прамовілі ўзаемна словы, сказанныя калісьці ўпершыню.



на





25 і 26 ліпеня